ДЗЯННІЦА

Вестка Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

Асобны №. каштуя усюды 35 кап.

№ 17

ВАРУНКІ ПЕРЭДПЛАТЫ:

	На 12 мес.	На 9 мес.	На 6 мес.	На 4 мес.	На 3 мес.	На 2 мес.	На 1 мес.
У Расеі	15р.—к.	11р.50к.	8р.—к.	5р.20к.	3р.90к.	2р.60к	1р.30к.
За граніцу	20р.—к.	18р.—к.	12р.—к.	8р.70к.	6р.—к.	4р.—к.	3р.—к.

Калі выпісваяцца разам некулькі №№, та робіцца уступка на 20%.

Перамена адрысу каштуя 50 кап.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52.

Масква, 1918 г. 30 Юня. **Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц.** І-й год выданьня.

Канцылярыя Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту адчыняна што дня, апроч сьвят, ад 10 г. да 4 гадзіны дню.

Бѣженскимъ Отдѣломъ Бѣлорусcскаго Національнаго Комиссаріата съ 27-го сего мая новаго стиля производится перепись бѣженцевъ изъ Бѣлоруссіи, проживающихъ въ гор. Москвѣ, независимо отъ ихъ національности.

Перепись производится особыми счетчиками. Всѣхъ бѣженцевъ изъ Бѣлоруссіи просятъ зарегистрироваться.

Бѣженскій Отдѣлъ Бѣлорусскаго Національнаго Комиссаріата.

Ко всѣмъ Бѣлорусскимъ организаціямъ.

Бѣлорусскій Національный Комиссаріатъ проситъ всѣ организаціи Бѣлоруссовъ (партійныя, крестьянскія, профессіональныя, бѣженскія и проч.), стоящія на платформѣ власти Совѣтовъ къ 20 іюня сего года дать знать о своемъ существованіи и представить по возможности наиболѣе полныя свѣденія о характерѣ своей дѣятельности, количествѣ членовъ, средствахъ и т. п. Всѣ свѣдѣнія и запросы направлять по адресу Бѣлорусскаго Комиссаріата (Москва, Поварская д. 52. Телеграфный адресъ, Москва—Бѣлнакомъ.

Бѣлорусскій Національный Комиссаріатъ.

Масква 30 юня.

Тыя вялікія уступы па дарозя да сацыяльнае збудовы, якія зрабіу расейскі работнік і бедны-працавіты селянін у тэрмін равалюцыі есць вядома, надта крэпка узварухнулі агульна чалавечая жыцьціо. Зусім ня удалекія часы як раз перад гэтым ніхто і ня сніу навэт таго, што хутка сталася перад яго вачу на яву. Канешня, весь развітак грамадзянскаго жыцьця с пакон вякоу, праз асобныя законы, кіравау яго, гэта жыццё, тым напрамкам, які вядзе да сацыялізмы, (бач да гэткаго парадку і збудоулі люцкога жыцьця, калі усе дабро на зямлі становіцца агульна люцкім), і усе сацыялісты гэта азнавалі ды у імя яго вялі сваю барацьбу з прыгонным парадкам гвалтоунасці, але ніхто усе-такі ня мог спадзявацца, што прыход яго адзначыцца так хутка і што на долю расейскаго работнічаго народу выпадзя шчасця быць першым яго правадыром у жыцьці. Гэта вялікая заслуга расейскаго работнічаго клясу і працоуны люд усіх краіоу і народау, дзе яшчэ далека усе ад гэтаго, дауно ацаніу яе; цяпер весь час з цікауным настроям сачыць іон за далейшым развіцьціом сацыяльных заваіоу расейскай равалюцыі.

Сачыць і падгатоувал у сябе глебу, сея сем'я ды чакая тае хвілі, калі яно пасьпея, каб раптам сарваць яго.

І як дорага усясьветнаму працоунаму народу расейская равалюцыя і яе далейшы паглыб, так страшна воражна з'яуляяцца яна ля буржуазеі усіх краіоу і усіх народау, якая наадварод, ня толькі са спугным сэрцам сачыць так сама за яе поступам, а і усімі сіламі ды усею магою стараяцца забараніць яго і згубіць равалюцыю. Карыстаючы цемрывасцью некаторых частак народу і маючы у сваіх руках крэпкую сілу адурманяных і абманутых людзей, яна стараяцца як хуччэй скончыць са зданьням сацыяльнаго перакруту. І мы бачымо, як цяпер гэта буржуазея усяго сьвету, зберагаючы можнасць далейшаго свайго уладарства над працоуным народам, ахапіла жалезным кальцом залаты вострау расейскай свабоды. І німа чаго таіцца, што пад крэпкім і сільным яе нацавам цяжка прыходзіцца ля самае свабоды.

І яшчэ горай гняне гэта цяжаць таму, што ікрас, побач с тымі, каму канец нясе сацыяльная равалюцыя, стаяць і тыя, так празываныя сацыялісты, якія навэт гарачэй і ахвотняй стараюцца вясці вайну супроць таго, што, здавалася б, і ім мусяла б быць дарагім.

На папіханьні у буржуазеі, на услузя у яе, гэты згоднікі сацыялісты кінулі і думаць аб тым, што, на прыпадак паборы буржуазеі, і ім ня пашчасьлівіцца! Не! Гэтаго яны ня думаюць, бо цяразчур зайшлі далека у пабратаньня з панамі і грашаушікамі. Трудны час, пакінуты у наследзя каляцыйным урадам, голад, Брэсцкую згоду і усе уселякая стараюцца скарыстаць гэты варагі, каб як больш зрабіць нязадавольных цяперашнім палітычным палажэньням і усякі контар-равалюцыйны бунт нясе ім рыжовыя надзеі на прыход жаданаго ім'і звертаньня мінулых прыгонных парадкау. Прауда, усе паустаньня покуль што скончыліся гібельпа ля чорнасотніцкіх паустанцау і ужываньню іх надзей тэрмін адыходзіу далій і далій. Німа чаго казаць, апошні час—стау случным часам ля расейскай сацыялістычнай распублікі, але мы спадзяемся, што працоуны народ шчэ шмат мая сілы, змацаванай цвіордаю вераю, аб якую зможа разбіцца патуга буржуазеі і яе хаурусьнікау, усякіх прыхвасняу.

Дык сілкуйцеся, браты, усе уставайця на забарону Вялікае Расейскае Распублікі, калі пяхочаця пайсці у страшны прыгон, які нясе яе пагібяль. Працоуны народ, пан і кіраунік свайго жыцьця, ня атдавай яго смяртэльнаму ворагу, буржуазеі, ваяупічаству і грашаунікам. Трымайся, табе на падмогу у хуткім чася падыдзя міжнарадовы працаунік.

Да абароны!

Да бойкі!

Рупіць.*)

Замацаваньня работніча-селянскім правіцяльствам Беларускаго нацыянальнаго камісарыяту і яго паспеховая істнаваньня вось ужо колькі часу, як громам удырыла беларускіх незалежнікау з сямьі польска-беларускае буржуазеі і яе напіхача сацыял-шавіністау; памогшы колькі было сілы палякам і немцам зрабіць спакой у Мінску, яны думалі, што за нямецкім драцяным загарадам у аслабонянум ад бальшавікоу горадзя можна спакойна, нікому няведама рабіць праступковую працу—прадаваць з адчыняного торжышча інтарэсы беларускаго працоунаго народу за некую здань нечай «Незалежнасці». Тояж, што за межамі, у Расеі, ня засталося ніякае грамацкае беларускае арганізацыі—падагравала іх на задуманую работу яшчэ боляй. Каму ж пярэчыць, чаго баяцца? У выканаучым камітэця агульнабеларускаго з'езду усе беларускія партыі прыстауляны і, значэ, ніхто, ня зможа і ня станя прашкодзіць ім. Аб тым жа, што пецярбурскія арганізацыі Сацыялістычнай Грамады і Беларускай Сацыялдамакрацкай Работнічай Грамады і спагадчыя ім былі нязгодна настрояны з імі, незалежнікі мала дбалі. Аднак, с часам, ім прышлося ня толькі падбаць, а і крыху спужацца. Праца лівых беларускіх сацыялістау пахвільна расла і шырылася і пад канец дайшла да таго, што прыняла той облік і тую вагу, якія мая цяпер створаны імі Нацыянальны Камісарыят. Вось гэта ікрас і стала сярод дарогі беларускай буржуазеі з яе шчырымі служкамі сацыялістамі згодчыкамі у іх працы прадаушцтва.

Работа Камісар'яту у справя асьветы і арганізацыі, есць вядома, ім нястрашна, бо яна і облік мая свойскі. Ня тоя уражэньня робіць «Дзянніца».

Ад яе вока ня зхаваліся пакуль што самыя паважныя праступкі буржуйнай Рады і Сакратарыяту, як згаворы з украінскімі прадаунікамі равалюцыі, як цяляграма да Вільгельма і шмат ін. Шырачыся між уцякачоу і у пязабрануй частцы Беларусі, «Дзянніца» разносіць гэты весткі тысячам людзей, якія мусяць ведаць аб усім тым, што чаупецца за драцяным загарадам. Гэта усе вядома прахадзімцам у беларускуй справя і яны увасю стараюцца заняуважыць у воку беларускаго сялянства і працоунае інтэлігэнціі «бальшавіцкую Дзянніцу». Праглядаючы зарубежныя часапісы, тоя й бачыш, што натыкаяшся у іх на гнусную лаянку і плёткі, якія сыплюцца на нашу газэту за яе праудзівасць і незалежную шчырую равалюцыйнасць. Канешня — «Дзянніца» ім рупіць! Рупіць больш усяго, і прагныя думкі, каб яна памерла хуччэй — нядаюць ім спакойна сядзець... Нядаюць—і нядадуць бо ім ужо ня удасца захаваць нічога ад люцкога вока... «Сацыялістычная гразь» (словы кіяускіх беларускіх чорнасотнікау)—есць рэч ліокавая, якая у хуткім чася уздымя со-сну весь працоупы люд на зямлі, каторы паложыць канец жыцьцю буржуазеі і [illegible]чом - сацыялістам - прадаушікам. Можна быць смелымі да часу, пакуль кіруя нямецкая рука штыхамі—але тоя надоуга. За лесам гэтых штыхоу есць можнасць ля усякай прадажнай творчасці... Будзя час—і хутка!—калі гэты штыхі павернуцца у другі бок! Вось ачуваючы блізкі прыход яго і скрыгіча адчаянна зубамі усесьветная буржуазея. Іх скрыготка радуя нас і дае веру у спор нашае працы. Нехай жа рупіць яна ім — мы працаваць ня кінам—а мусім старэньняй узяцца. На помач «Дзянніцы» павінна загарэцца боляй яскравых праменных зорак, ад сьвятла якіх бы загінулі совы і кажаны страшэннага ліхалецьця—наплыушаго на Беларусь — нашу родную зямельку.

Шчыры Беларус.

*) Глядзі № 16.

ХВІЛЯМІ.

У каморцы ціха, цемна;
Гарыць газначка таемна,
Ляжаць цені на сцяне...
    Думкі усюцца чарадою—
    Ня даюць й на міх спакою,
    Ня адходзяць ад мяне:
Та ускрашаюць яны цені
Дніоу вялікаго цярпеньня,
Днеу пакуты і бяды—
    Та убіраючы украскі
    Мне мулюють яны казкі
    Нязбывалае науды.
Я міжвольна атдаюся
Абразам іх і раблюся
У раз рухавым і жывым;
    Кроу па целу варухая—
    Сэрца верыць застауляя,
    А будзіонная, бы дым
Мне здаецца, у шэрум змроку
Няпрыкметным, хуткім крокам
Пакідая у раз мяне.
    І газоука у след за гэтым
    Ужо іскрыстым вокал сьветам
    Глядзіць міла у вочы мне.

Цішка Гартны.

Хаурус пашыраяцца.

Той хаурус, які завязалі між сабою з ваднаго боку сацыялісты-згодчыкі другога буржуазея на конт барацьбы супроць цяперашняго устрою Расейскай Распублікі, с кожным днюм пашыраяцца і глубіцца, робячыся шчырэйшым і ахапляючы усе бакі развіцця тактыкі (спосабу) барацьбы супроць усіх заваіоу работніча-селянскай равалюцыі.

Як і усе хітрыя і мудрыя рэчы, гэты згавор між варагамі пашырэньня равалюцыі і яе сацыяльнай ахварбоукі так сама мая асоба выробляны плянны напрамак апіраючыся на аднакавасць буржуйнай істнасці абудвых хаурусьнікау. Чынным парадкам, пунта за пунтаю, ен пасуваяцца даляй і к цяперашняму часу мы робімся сведкамі таго, што і мелася стацца. Найболяй цікауняйшым ля нас робіцца тая пунта згавору між правымі сацыялістамі і буржуазеяй, якая с першаго зірку здаецца зусім няпрыкметнай і ня вельмі паважнай, а па праудзя, усамдзелячы, маючая велізарную вагу, як і у мінулум ціоку расейскай равалюцыі, гэтак і мусячая звернуць на сябе далейшую увагу і у будучым развіцьці яе. Справа ідзе аб нацыянальнум пытаньні. Усім добра вядома які напрамак у адносінах да яго кіравау калісці і іх цяперашнім хаурусьнікам буржуязеяй, калі іх сьвята мела свой росцвіт. Тады найболяй с.-р. лічыліся самымі шчырымі спагадчыкамі нацыянальнаго руху сярод расейскіх, так празыванных, нядзяржауных народнасцяу і навэт мелі у сваіой праграмі, калі няашукваямся, пунты аб фэдэрацкум устройсцвя Расейскай Распублікі. Прауда, што гэта толькі і абмежвалася тым, што зіхацела цьмяна з сухіх странічак праграмы, у жыцьці ж нічога гэткаго імі ня праводзілася. Трымаючы валадарства Расеяй у часы першаго перыяду расейскай равалюцыі, правыя с.-р., меньшавікі і поміж жа буржуазея, заусюдная іх праводніца, як мага стараліся пярэчыць нацыянальнаго [illegible] руху, які выносіуся праноучымі масамі, і гэтым напрамк[illegible] прымау [illegible]—царскую мужы, [illegible] селяніна і работніка аслабленых [illegible] у ахопы іх буржуазеі. Праводзючы у жыцьцю зусім ня равалюцыйны кірунак у нацыянальнуй палітыцы, яны усе-ткі ня переставалі лагодна пеяць аб добрых сваіх думках і шчырых зычэньнях. На гэты песьні вымагала іх крыху дэмагогія, крыху той звязак праву жыцьця, які зусім ня гадзіуся з іх думкамі Жыцьцё і закон яго развіцця, а так сама лагічны поступ у пагублені равалюцыі, рабілі сваю справу, і скутак выяуляуся досі ясна.

Нацыянальны рух пашыраўся сваім чарадом, робячыся настаяшчым ворагам «пануючаго курсу». Яскрая і справедлівая азнання істнасці яго з боку бальшавікоу і вырабіушыя з-за гэтаго спраудныя адносіны да яго, далі значную вагу у іх рукі, завабіушы да іх сымпатыі працоунаго народу усіх нацыянальнасцяу... Далейшы час ляпей лепшаго паказау усім, хто сапрауды застауся разумнейшым палітыкам і шчырэйшым сябрам быушых „прыгнячэных“ нацыянальнасцяу. Досыць паказаць на прыклад Фінляндзі, дзе доуга прышлося бараніць расейскаму селяніну і расейскаму работніку незалежнасць яе працоунаго народу ад собсцвянай і міжнароднай буржуазеі. З другога боку, на штандары Расейскай Радавай Распублікі і цяпер выразна красуяцца слова «Фэдэрацкая». Тым часам быушыя ахавайцы і абаронцы „самых шырокіх свабодау у ва усіх бакох жыцьця“, правыя сацыялісты (ужо ня кажамі аб так звануй ліберальнуй буржуазеі) у мернум ходзя развіцця дайшлі да таго, што нашчэнт сазналіся у тым, хто яны ёсць і як глядзяць на нацыянальнае пытаньне. Досыць толькі пасачыць за іх газэтамі і паслухаць іх гутарак, як на першум мейсту у іх стаіць пытаньня: „аб Вялікуй, нядзеляннуй Расеі“.

І слова у слова, думка у думку, як у буржуазеі, гэтак і у «сацыялістау»! Дымам выляцела усякая паметка на самаапрадзяленьня і на усе лады абгаворванца спосаб стварэньня некае асобнай Расеі... бач, хаваць ня трэба, той самай Расеі, якая была пры нябошчыку (у упраунум сэнся) цару: тыя ж запрэты кніжак і газэт на другіх, апроч расейскай, мовах, той жа насад руссыфікатарау чыноунікау, папоу і вучыцяляу, і, як скутак іх працы, узраджэньня з новай гострасцю паміж нацыянальных адносін. Яны бачаць (прыклад украінскіх чорнасотнікау і буржуазеі). што раз гэту шчыліну лепі пралесці, што за гэты сучок лепі ухапіцца, вядучы барацьбу с цяперашняй управай і з няаслабна ідучым развіцціом равалюцыі... На абмен за гэту сваю працу, яны скінулі і адцураліся (бо відаць шчыра і ня верувалі у іх) ад усякіх равалюцыйных лозунгау на сваіх газэтах і шчыра прычапіліся да аднаго „Збору зямлі расейскай“. Ніхто, само сабою, нічога ня меу бы супроць гэтаго, каб было ведама, што гэны „збор“ мая роуную значнасць з выробляньням единаго равалюцыйнаго хронту, чым яны пачасту і прыкрываюцца; але добра знана, што гэта ня увайходзіць у іх праграму, бо, наагул, усякі пашыр равалюцыі, як мы адмечалі вышэй, ім воражан. Той жа хаурус, каторы яны маюць з буржуазеяй, вымушая зварочваць зірк у другі бок, у той, дзе хаваюцца выгады ля паноу і грашаунікоу. Прыклад хурманшчыкау іх, кадэтау, на Украіня, на Дану, у Сыбіру, Крыму і іншых местох, ня даюць ім вольна і спакойна спаць...

З нашаго узгляду, дабравольная агаленьня іх істнасці дасць можнасць кожнаму разабрацца у тым, хто і што яны есцяка сапрауды. Покуль жа што, пажадаям новым „велікадзяржауцам“ посьпяху у справя «Збору зямлі расейскай» спосабам самадзяржаунаго правіцяльства.

Змітро Жылуновіч.

Хаценьня.

Каб я птушкаю быу,
Каб умеу я лятаць—
Я б у лесе ня жыу,
[illegible]
І нехацеу бы звіваць
На дзярэвах у гаю
Гнязда-хатку сваю.
Я б прывольля паліоу,
Зелянiстасць лясоу,
Ліогкасць ціоплых вятроу
І празрыстасць вады —
Занядбау бы тады.
Яб зауседы лятау
Між высокіх дамоу,
Дзе чуціон гучны роу
Ад машын ды гудкоу;
Дзе у халодных сцянах
На здранцвелых нагах
Соткі тысяч людзей
Сваю працу нясуць.
Каб я птушкаю быу,
Я б у заводах тых жыу
Й дзень ато дня упадрад
На вакнах паміж крат
Свае б песьні пеяу,
Каб чуваючы іх
Сапачыць мох на міх
За работай цяшкой,
Хто стамліоны душой;
Каб аттуль, куды ліос
Запіхнуу яго жыць,
Свае думкі іон зніос
На прыродны прастор,
Між паліоу пагуляць
Паразвіцца між ніу,
Каб я птушкаю быу,
Каб умеу я лятаць.

Цішка Гартны.

Праф. М. Даунар-Запольскі аб незалежнасьці Беларусі.

Праф. М. Даунар-Запольскі, вядомы сваімі працамі па гісторыі Вялікага Князьства Літоуска-Беларускаго напісау с прычыны абвешчэньня незалежнасьці Беларусі перадавую стацьцю у кіеускай беларускай газэці „Беларускае Слова“, у каторай між іншым кажа: „Лесы зроблены! Вялікі акт у жыцьцю нашаго народу зьдзейсьніуся: Беларусь абвешчэна сваім часовым урадам нязалежнай распублікай. У кожнаго беларуса пры гэтай вестцы радасна заб'ецца сэрца. Натоуп трывожных і сьветлых пытаньняу павінен прамігнуць у галаве кожнага з нас: ці маем мы права на гэты крок ці у час гэты крок зробляны і—галоунае—што чакая нашу Бацькаушчыну наперадзе?

Мне думаецца, [illegible] ня патрэбна даводзіць, што беларускі народ мая права на самаазначэньня, на незалежнае бытаваньне.

Мы прадстауляем нацыю адменную ад другіх народау сваей мовай, этнаграфічнымі асобнасьцямі і агульным культурным укладам жыцьця, утвораным гістарычна. Ужо адзін гэты варунак дае нам права на нязалежная дзяржаунае істнаваньне. З гістарычнага боку мы прадстауляям сабою нацыю, катэрая толькі каля 150 гадоу была правінцыяю Расейскай імперыі. Да прылучэньня да Расеі Беларусь пяражыла тры пэрыоды гістарычнага жыцьця. Да 14-га веку яна складалася з некулькіх княізьствау, меушых кожная значэньня нязалежнаго гасударства. У 14-м сталецьці Беларусь самахоць злучылася з Літвой і да 1569 году прадстауляла сабою нязалежная дзяржаунае цела. І пасьля 1569 г., злучыушыся актам Уніі с Польшчай, Беларусь не страціла сваіх сувярэнных правоу, астаючыся некулькі сталецьцяу фэдэратыунай часьцю аднае Рэчы Паспалітае — Польска-Літоуска-Беларускага гасударства. Яна ня была правінцыяю Польшчы і заховывала сваю дзяржаунасць. Мы гістарычна звыклі да вольнага урадаваньня, адабранага у нас Расеяю...

Усе гэтыя асобнасьці нашае Бацькаушчыны і нацыі даюць нам гістарычная права на пязалежная істнаваньня. Але пытаньня месьціцца у тым, ці у час выбраны мамэнт для абвяшчэньня Беларусі нязалежнай распублікай? З усяго таго, што нам дагэтуль вядома аб палажэньні на Беларусі, аб яе пакутах, мы с цьвердасьцю можам сказаць адно: іншаго выхаду быць ня магло. Мы ня сьпяшаліся адлучацца ад нашае усходняе суседкі, але петраградзкіе загадчыкі абрабілі наш бедны край, ня далі злажыцца ураду на фэдэратыуных або аутаномных асновах і кінулі нашую Бацькаушчыну на літасць лесу. Пры гэткіх умовах наш часовы урад павінен быу зрабіць тое, што ен зрабіу.

Дзяля выказанага мы ня можам не вітаць зьдзейсьненага факту. І мы усе беларусы павінны помніць, што цяпер становішча нашае Бацькаушчыны накладая на нас цяжкі і адпаведальны абавязак. Мы павінны усе злучыцца, мы павінны напружыць усе свае сілы фізычные і культурныя дзеля таго, каб аппраудаць нашае права на самабытная істнаваньня, абараніць незалежнасьць нашае Бацькаушчыны. Да згоднай працы, браты!“

Разалюцыя.

Аб палітычным палажэньню Расеі і Беларусі, прынятая 9 юня 1918 г. на агульным зборышчы беларусау гораду Масквы і ваколіц, абраным сэкцыяй беларусау, існуючай пры цэнтровым камітэту партыі лівых с.-р. (інтарнацыяналістау).

Праслухаушы гутаркі прамоуцау, якія абмулявалі палітычная палажэньня у сучасны момант Расейскае Радавае Фэдэрацкае Распублікі у звязку з захопам

Фэльятон.

Начальства ня паладзіла.

У хаця Рады на гэты раз быу нязвычайна клапатлівы і рухавы час. Усе міністры і проста сябры рады збіраліся праводзіць да гэнерала нямецкаго сваю далягацыю... парухаць грунт на усякі прыпадак, а вось і „Нязалежнасць“ ужо пад бокам. Гутаркі і парады ішлі на усе лады: хто што меу на вуме, тоя выпускау на язык і шчыра старауся, каб пасланцы у немцау няйначай па ягонаму вялі рэчы. Вось з гэстае прычыны пасланцы весь час былі аблепляны цэлаю грумадаю сяброу і старэнна адмахваліся ад іх рукамі. Ды чаму ж не адкараскавацца! Ласьня яны самі ня ведаюць, што казаць вяльможным панам-немцам! О, гэта ім ня першыня з'імі гуторыць—ужо адукорыліся—к чаму ж тыя парады другіх? Ды і у прауду усе было, хіба знарок, ля надазолу—іначай нельга было з'ясніць! Бач дапутацыя была з адмысловых людзей: сам прэзас сакратарыяту, ягомасць Варонка быу за старшога у ей!

Можна было класці усю надзею і спадзявацца добраго канца!

Ціж змогуць яны удырыць у гразь тварам перад немцамі!

Ва-а-ронка-а сам!.. Але! Пачакайця! І самыя рыжовыя спадзеукі засмучаюцца прыпадковымі здарэньнямі. А прыпадак—масней часу, — сказау знатны нямецкі пісар—Г. Гэйня. І тоя, што быу прэзас Варонка за старшога—ікрас і набрудзіла.

Бач другім на заяпасці [illegible], ведаяця хто?—Фон Аляксю-у-к!!! Вось тоя, што гэты ягомасць быу другім, а ня першым—і вышла уся штука! А штука—проста на уздзіу, па смех! Слухайця!

Сеушы на звошчыка—махнулі да немцау далягаты. Ім удагон слалі пазычэньня, махалі шапкамі... Прыехалі. Чын чынам увайшлі у пакоі к начальству, вядома, гадзін со дзьве прастаяушы за парогам. Сталі у радок, склаушы рукі:

— Вітаям! — палахліва праказалі. — Пасланцы ад Беларускае Рады да вашае міласці...

— Сядайця, чым магу дапамагчы?— далікатна праказау сур'езны гэнерал.

— А вось, я, Ваша правасхадзіцяльства, старшы Народнаго Сакратарыяту Беларускай Нез... Беларускай Распублікі, прэзас Язэп Ва-а-ронка,— толерантна, з панскім пахілам праказау Варонка.

— Ва-аша... пан гэнерал,— весь чырвоны, бы рак, слюнявячы, перабіу раптам Фон Аляксюк: іон ужо-о ня старшыня-а Сакратарыяту, Ваша Правасхадзіцяльства, іон... яго паперлі ужо з Незалежнае... з правіцялства... Ужо-о я... я ужо-о старшы-ы... за Скірмунтам перш...

— Ен ня прауду кажа—ваша міласць, —перабіу прэзас Варонка-а: я маю тую ж сілу і вагу, што і меу, я працую...

— Цябе Скірмунт выгнау...

— Яшчэ я яго выганю...

— Скірмунт мяне пасадзіу замеснікам. Я ужо-о,—матаючы кулакамі пад носам Варонкі, гучэу Аляксюк.

Нямецкі гэнерал, вытрашчыушы вочы, здзіуляна пазірау на дваіх спрэчнікау і... о, іон дужа хітры!—пасмейвауся у нутры. „Ай, і дурныя ж! Вось дык незалежнікі! Блазнота!

— Ну, дык у чым рэч, кажэця,— запытау немяц-гэнерал.

— Я, як заменік Скірмунта... завісу Фон Аляксюк.

— Я... я ад Сакратарыяту... перабіу прэзас Варонка.

— Іх трэба выгнасць, гэту пазолу,— праказау па свойму гэнерал і адхіліуся у бок...

Фон Алексюка усе-ткі спынілі і іон са слязамі на вачах, за сваю прыніжнасць, як святы, сядзеу з боку і маучау.

За тоя ж прэзас Варонка прыхрабрыуся і з жарам пачау утлумачваць гэнералу усю прауду аб справах... Толькі, як відаць было—хітры немяц пасміхоувауся... Гутарка кончылася... Варонку памарыуся блізкі прыход Незалежнасці, пачувауся яе подух. Поуны гардае вагі, іон шляхетна развітауся з гэнералам і вышау на вуліцу.

Бязмоцнаго, знішчанаго вывялі і Фон Аляксюка з пакоіу за дзьверы.

На дварэ яны разышліся у розныя канцы і весь час, памінютна, азіраліся, суструкаючыся паглядамі і раптам адварочваліся... Па горадзя шырыуся гоман аб паважных дыпляматычных згаворах між нямецкімі уласцямі і далягацыяй рады.

Сябры Рады пільна чакалі вялікіх навін. Незалежнасць бліжылася!..

Авадзіон.

АД РАДАКЦЫІ.

Рукапісы, якія прысылаюцца ля друку, павінны быць чытальна напісаны на адным боку паперы.

Няпрынятыя рукапісы звяртаюцца аутарам, калі ля перасылкі будзя прыслана марка. Малыя рукапісы ня варочаюцца зусім.

— —

РАДАКТАР ПРЫМАЯ ад 11 да 5 г.

— —

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52, тал. 1-51-63.

германскімі ваяунікамі (імперыялістамі) ваколіц Расеі, у асобку Беларусі, бяручы на увагу аканамічную цізкар і дамаганьня усясьветнай буржуазеі, зборышча вітая Радавую уласць за яе барацьбу, як з расейскаю буржуазеяй, гэтак сама і с паміжнарадовым ваяунічаствам за інтарэсы працоунаго народу, сялян і работнікау.

(Зробляная нямецкімі ваяунікамі (імпяралістамі), злучна з беларускаю буржуазеяю так празываная „Нязалежная Беларуская Распубліка“, есцяка нічога іншая, як спосаб да аканамічнаго (гаспадарска-жыццявога) і палітычнаго прыгону беларускіх сялян і работнікау), якія прыняслі нялічаныя ахвяры дзеля заваіоу сацыяльнае равалюцыі і якія падпадаюць цяперака пад усе страхі таго захопляннаго (акупацыйнаго) парадку, перад якім бляднеюць страхі дзікасцяу турэцкіх башыбузукау (разбойнікі-галаварэзы). Зборышча пратастуя супроць прадауніцкаго кірунку дзелу Мінскае Рады, пад простаю аховаю, з простаго благаславеньня хадайнічаньня, якоя прагалашая «Нязалежную Беларускую Распубліку». Цяперашняя зборышча, бяз адлічча партыяу, каб чуу весь сьвет кажа, што самаскліканая, прадауніцкая Рада, якая нямая нічога супольнаго з беларускім працоуным народам, ня мая права казаць ад імяні апошняго, намая права тяргаваць яго крывіою, яго будучынаю, у Бэрліну і Кіяві; нямая права прадаваць яго назаусягды у лапы германскаго ваяунічаства і атдаваць яго у прыгон мейсцовуй буржуазеі, бо воля беларускаго працоунаго народу настрояна да цеснаго яднаньня і братняй злукі з усіма велікарасейскімі работнікамі і сялянамі, з усею Радаваю Расеяю, якая высока трымая штандар барацьбы за правы і вольнасці працоуных усіх краіоу усіх народау.

Зборышча вітая праудзіваго выказчаго волю працавітаго народу, партыю лівых с.-эр. (інтарнацыяналістау) ды поунасцю адобрывая і як мага будзя падтрымоуваць узяты ею палітычны напрамак.

Томячыся зненавісцю да прадаушікау-багацеяу, захоннікау і гвалтоунікау, якія мучаць самым дзікім спосабам увесь беларускі народ захопляных мейсцоу, да учутку усяго сьвету пратастуя і кажа, што ня дазволіць цярпець крыві бяз рапау, якую ссуць нямецкія і беларускія абірайцы.

Абвяшчая зрэшанную барацьбу і помсту за кроу сваіх братоу.

(Зборышча звяртаяцца з гарачым поклічам да з'еднаньня усіх беларусау у барацьбе за асвабаджэньня родная краіны, звяртаяцца з поклічам да усяго працоунаго народу Расеі, Украіны і усіх старонак памагчы нацыянальнаму атраджэньню і аслабаджэньню працоунае Беларусі,) памагчы іой змагацца з нямецкімі захошнікамі і гвалтоушікамі, якія нясуць з сабою пагібяль ля равалюцыі і узбудову панства буржуазеі.

Далоу заложаную гэрманскімі штыкамі „Беларускую Нязалежную Распубліку!“

Нехай жыве братні хаурус паміж сялянамі, работнікамі і салдатамі Расеі, Беларусі, Украіны і усіх народау!

Нехай жывуць рады селянскіх, работнічых і салдацкіх дапутатау!

Нехай жыве барацьба за вольнасць і правы працоунаго народу Беларусі!.

Кіраунік зборышча **Чадовіч.**

Пісар **Пятровіч.**

РЕЗОЛЮЦІЯ

по бѣженскому вопросу, принятая на собраніи-митингѣ всѣхъ бѣлоруссовъ и бѣженцевъ изъ Бѣлоруссіи, созванномъ секціей бѣлоруссовъ при Ц. К. партіи лѣвыхъ социал.-революц. (интернаціоналистовъ).

Заслушавъ докладъ о положеніи бѣженскаго вопроса, собраніе постановило:

1) Все бѣлорусское бѣженское дѣло должно быть передано въ руки самихъ трудящихся бѣлоруссовъ-бѣженцевъ.

2) Необходимо организовать бѣженцевъ-бѣлоруссовъ, разселенныхъ по всей Россіи и выдѣлить волостные уѣздные, губернскіе и областные комитеты бѣженцевъ изъ Бѣлоруссіи.

3) Необходимо провести немедленно рядъ Съѣздовъ бѣженцевъ-бѣлоруссовъ: волостныхъ, уѣздныхъ губернскихъ и областныхъ. Необходимо стремиться къ созыву Всероссійскаго Съѣзда Бѣлорусскихъ Бѣженскихъ Комитетовъ.

4) Необходима самая широкая матеріальная, трудовая, санитарная, медицинская и культурно-просвѣтительная помощь бѣженцамъ-бѣлоруссамъ.

5) Для большей продуктивности работъ Комитетовъ, послѣдніе должны находиться въ тѣсномъ контактѣ съ лѣвыми политическими партіями.

6) Необходима самая дѣятельная подготовка къ ревакуаціи и немедленное разрѣшеніе вопроса о ней Совѣтской Властью, посылка делегаціи на покинутыя мѣста, чтобы къ моменту созыва Всероссійскаго Съѣзда Бѣженскихъ Бѣлорусскихъ Комитетовъ выяснилась вся обстановка бѣженскаго дѣла въ оккупированныхъ областяхъ.

Собраніе находитъ, что всѣ эти заданія должны быть выполнены Бѣлорусскимъ Національнымъ Комиссаріатомъ совмѣстно съ бѣлорусскими бѣженскими комитетами.

Вмѣстѣ съ тѣмъ, всѣхъ братьевъ бѣженцевъ, возвращающихся на родныя мѣста, мы призываемъ всѣми силами беречь то великое, что дала октябрьская Соціальная Революція всѣмъ трудящимся и обездоленнымъ. Мы зовемъ свято хранить всѣ лозунги революціоннаго соціализма, чтобы доказать грубому юнкерскому завоевателю, что жива и будетъ жить революція.

Резолюція

Общаго собранія гражданъ Шалаховской волости. Мая 9 дня 1918 г.

Мы, граждане Шалаховской волости, Невельскаго у. Витебской г. собравшись въ числѣ 500 человѣкъ при помѣщеніи своего Волостного Совѣта обсудили положеніе нашей родины въ связи съ тѣмъ фактомъ, что прибывшая въ Совѣтскую Федеративную Россійскую Республику Германская Комиссія по проведенію въ жизнь Брестскаго мирнаго договора насильно требуетъ, чтобы часть Федеративной Республики—Бѣлоруссію, въ какой и мы находимся, отдѣлить отъ Россійской Федеративной Республики и якобы желаютъ сдѣлать Бѣлоруссію независимой отъ Россіи, самостоятельной, то мы громко заявляемъ свой свободный гражданскій голосъ протеста противъ такого насилія имперіалистовъ надъ свободнымъ народомъ, который цѣлые вѣка несъ на своихъ плечахъ непосильную ношу—иго царизма, ибо мы хорошо знаемъ, что германскіе правители, царя и генералы—разумѣютъ подъ отдѣленіемъ Бѣлоруссіи отъ общей Россійской Республики. Мы знаемъ, что не дать намъ желаютъ германскіе генералы свободу, а отобрать ее и сдѣлать насъ своими рабами, такъ какъ свободный народъ Бѣлорусскій не требуетъ и не добивается ни у кого и ни передъ кѣмъ больше свободы, не проситъ ее какъ милостыню, а добился ее своими собственными руками и смертью борцовъ за эту свободу.

Добывали дорогую для насъ свободу всѣ мы вмѣстѣ: и бѣлоруссы и великоруссы и малоруссы и поляки и евреи и другіе народы и потому мы бѣлоруссы всѣмъ братья и намъ всѣ—насъ одна общая семья и никто не смѣетъ насильно навязывать намъ ненужное отдѣленіе, разбивать нашу одну семью общей Совѣтской Федеративной Республики. Не помочь намъ намѣрены германскіе дипломаты удержать добытую свободу, а отнять, вырвать изъ рукъ послѣднюю; имъ не нравится что у насъ правитъ страной самъ народъ въ лицѣ своихъ избранниковъ и мы видимъ какую свободу получилъ Украинскій народъ, отдѣлившись отъ насъ и отъ Россіи. Германскимъ имперіалистамъ легче закабалить отдѣльную группу народа, чѣмъ всю Россію и вотъ они намѣрены отдѣлить Бѣлоруссію, какъ Украину, чтобы натравить одинъ народъ на другой и тогда по частямъ повернуть въ свою сторону, заставить служить въ кабалѣ своимъ баронамъ. Мы хорошо знаемъ, что значитъ самоопредѣленіе народовъ подъ давленіемъ каблука нѣмецкаго имперіализма. Отдѣлиться Бѣлоруссіи отъ Совѣтской Россійской Республики, значитъ потерять всякую надежду на самоопредѣленіе, потерять добытую свободу и стать на долгое время, а быть можетъ и вѣчнымъ рабомъ и батракомъ нѣмецкихъ насильниковъ.

Мы вѣримъ, что не трудовой народъ Германіи требуетъ отдѣленія Бѣлоруссіи отъ Россіи, такъ какъ онъ знаетъ, что всякій трудящійся свободный народъ противъ такого дробленія, разъединенія и розни, а требуютъ этого германскіе правители—ставленники царя Вильгельма. Мы сами завоевали свободу и сами устроимъ свою судьбу, а не нѣмецкимъ офицерамъ и чиновникамъ, будучи служителями царей устраивать судьбу свободнаго народа. Мы вполнѣ сознаемъ, что получивъ независимость отъ Россіи, получимъ полную зависимость отъ Гер-

М, Капыль у Равалюцыі.

(Працяг. Глядзі № 16).

III.

Гэтак, усе у адзін голас перaказвал байку, што у дамакраства запісваюць асобныя людзі і запіс вядзецца у чорнуй тоустуй кніжца, а тых жа хто запішацца, на тым сьвеця Бог пакарая, а на сім начальства, як зловіць, жыуіом у яму закапая. Такімі страхамі мацяркі пужалі сваіх сыпкоу і дачушак, перашыняючы іх ад запісу у дамакраства. Нават пачалі з некай асцярогай атдаваць вучыцца за гарбароу, каб гэтым ня згубіць дзяцей. Поруч трэба ня прапусціць адмеціць, што боляй усяго гарбары і прычашчаліся да равалюцыйнаго руху... Апроч рожных лягэпдау, стваралмых цёмнымі капылянамі аб дэмакратах, якія зусім былі ня страшны ім, скора усвоілі некаторыя ад іх, (вельмі рэдкія) даношчая рамясло.

Дзе ня маглі высачыць шпіоны і капыльская начальства, там ім прыходзілі на помач.

Першымі і самымі глаунымі даношчыкамі-шпіонамі сталі два мешчаніны-капыляня: жыд Бэргяр і беларус Раман Малевіч. Бэргяр пачау рабіць даносы на бундаущау, а Малевіч на сацыял-дамакратау-мешчан. Першым, на каго даніос Бэргяр—гэта быу тав. Драгунскі, на якога той злавау за тоя, што у яго Драгунскі адбівау заработак, вучачы дзяшавей і лепш дзяцей. Пошля даносу Бэргяра была закрыта і запячатана капыльская бібліатэка і зробляна шмат обыскау; а так сама яшчэ пільней сталі сачыць за многімі сябрамі як бундаускай, гэтак і сацыял-дамакрацкай арганізацыяу. Стала чуць ня нельга збірацца ні у кватэры Шафрановіча, ні у кватэры Драгунскоіе. Нават сочка пашла за гуляльнымі зборнямі, дзе пачыналі разганяць молаць і пядаваць ні пеяць, ні збірацца. Пашлі мосныя рапрэсы, і яшчэ грозілі яны памацнець у далейшум. С пачатку ніхто ня дагадвауся, дзе і хто іосць даношчык.

Даведаушыся ж, устала думка у някаторых, каб пазбавіцца ад яго. Думкі гэтае доуга ня хавалі і нікому ня перадаючы, скора ужылі яе. Вясною у 1904 г. аднэю ноччу Бэргяр быу забіты каламі ля калодзязя, пядалека свае хаты.

Гэта здарэньня нарабіла шмат гоману па усіом павеці, але апроч дзямакратау, ніхто ад жыхароу, за малым лікам, ня дагадвауся, за вошта і хто забіу Бэргяра. Дагадкі палі па многіх хлопцау, з якіх троя Н. Малевіч, І. Красуцкі і Г. З. былі заарыштованы і сядзелі з'год у вастрозя. Сваякі і сябры Бэргяра узнялі ялік суд і зразу сталі вінаваціць за палітычная убіуства. Абвінавачваныя, якіх было каля дзесяці чалавек, ля свае абароны запрасілі найлепшых адвакатау, Калашнікава з Гомялю, Ратняра з Кіява і Заруднаго. Суд цягнууся доуга, але пя знашоу прыцяпутых вінаватымі і усіх апраудау. Справка была выграна, але сочка за равалюцанэрамі дайшла да таго, што нельга было і думаць, каб сабрацца у мястэчку. Прыходзілася сходы рабіць таемна і па лясох, пазначаючы іх за кароткі час да адбыцьця. На гэты сходы ішла па асобку, двума ці трыма зараз, але заусягды збіралася многа моладзі і пажылых мужчын. Узрост равалюцыйнаго руху у Капылі звярнуу на сябе у вагу Мінску і капыльскія арганізацыі, трэба сказаць, хоць насіушыя два ім'і, але работу вядучыя заусягды разам, карысталіся прыездамі вядомых агітатарау. Ня можны друк, які толькі выдавауся цантровымі камітэтамі, ня мінау і Капылю і паусюжыуся багата па сіолах і па дарогах.

Апроч прысыланых кніжак, лістовак ды газэт, капыльскія арганізацыі на кожная паважная здарэньня у гасударскім жыцьці ці у жыцьці мейсцовым, адгукалася друкаванымі на гэктографу праклямацыямі, якія поччу разленваліся па мястэчку. Друк адбывауся кожны раз у асобным мейсцу, у гумнах, ці у паграбох; стараліся дужа зрабіць усіо гэта сакрэтам і дзе хавалася друкарская машына-мала хто ведау: толькі тыя, каму выпадала рабіць гэту работу.

Работа гэта, па друку адозвау, была хоць і занятная, але дужа марудная і цяжкая. Трэба было перш ад рукі павыводзіць як друкаваныя літары, а потым праз усю ноч сядзець пры газоуца ці свецца і атціскаць. Апаска была вялікая, бо трэба было хавацца ад усіх, каб ніхто ня прыкмеціу і няразбалхвіу.

Адным словам—работа ня ліохкая. Спадобнай да яе была і другая важная работа—гэта распаусюжваньня друкаванаго слова: бач гэтым змервалася уся агітацыйная праца сярод селян. Прауда, стараліся рабіць знаемства і передаваць па рукі, але боляй вярнейшым спосабам лічылі капыльскія сацыялісты раскідаць адозвы па дарогах. Першыя разы на гэту работу выходзілі ноччу перад кірмашом і разсыпалі па шляхам, а потым у сьвятошпія і кірмашныя дні выходзілі адвячоркамі на дарогі і перадавалі у рукі ад'яхджаючым з мястэчка селянам. Гэтак вялі агітацыю „за-кардонам“.

Сярод мяшчан агітацыю праводзілі так сама намерна і гладка. Сярод жыдоу—рабілі бундауцы, сярод беларусау—беларусы; старых падгаворвалі старыя, маладых—маладыя. Перш з асцярогай прабавалі даваць тую ці іншую няможную кніжку, а потым, калі хлопцу ці мужчыня падабалася і той цікавіуся—яму сьмялей знайходзілі больш, а потым і зазывалі на сходкі.

IV.

(Равалюцыйны рух у Капылі, як і па усіой Расеі, дайшоу да пайбольшаго разціцьця к канцу 1904 году і пачатку 1905 г.

Вестка аб вялікіх забастоуках у шахтах і у паудзіонных гарадох, студэнцкія выступленьня — знаходзілі жывы отгук сярод самых бязцікауных капылян. Праца капыльскіх равалюцапэрау расла і шырылася.

Арганізацыі, як бундауская, гэтак і сацыял-дамакрацкая, выраслі да таго, што злучпя мелі у сабе боляй 500 сяброу. І гэта на пяць тысячау душ усіх жыхароу. Збоку нядауніх варагоу іх і проста цямнейшых напужаных мяшчан адмеціуся ні то прыхіл, ні то прывычча і усе глядзелі на іх сапраудным вокам. Тым часам начальства усе пільней і шчырэй старалася сачыць за праяваю агітацыі і нагул равалюцыйнаго руху. Боляй і часцей станавы пачау звяртацца да помачы к спрауніку і ня нарокам сталі пагаворваць аб салдатах.

(Будзя даляй).

Стары С.-Д.

манія. Мы знаемъ, съ кѣмъ мы должны идти и съ кѣмъ пойдемъ. Нашъ путь къ укрѣпленію завоеванной свободы только вмѣстѣ и въ полномъ союзѣ и единеніи съ Великой Свободной Трудовой Россіей.

Мы свободные граждане, какъ одинъ человѣкъ громко заявляемъ: прочь свои грязныя руки отъ нашихъ чистыхъ и святыхъ идеаловъ трудящихся! Прочь свои руки и отъ нашего права на свободное самоопредѣленіе!

Не вамъ своими штыками въ крови и насиліемъ намъ свободному народу устраивать судьбу. Своимъ громким голосомъ свободныхъ гражданъ мы надѣемся найдти откликъ и поддержку у другихъ своихъ свободныхъ гражданъ—братьевъ, могущихъ еще заявить свое право и выразить протестъ противъ насилія надъ нами свободными и снять уже наложенную пяту надъ бывшими свободными. Мы призываемъ своихъ братьевъ и сами заявляемъ, что мы никогда не пойдемъ противъ своихъ братьевъ и не отдѣлимся отъ такихъ же свободныхъ гражданъ, какъ мы сами, что мы не согласны дѣлиться на мелкія части, чтобы потомъ быть безсильными.

Мы до послѣдней возможности пойдемъ вмѣстѣ со всѣми гражданами Свободной Россійской Республики въ дѣлѣ завоеванія и укрѣпленія свободы трудящагося народа.

Мы привѣтствуемъ формированіе соціалистической арміи.

Председатель общаго собранія **А. Бобковъ**,

Члены: **А. Юриновъ, И. Поготійловъ, Д. Шаклатовъ, Я. Пѣтуновъ, Исаакъ Бобобонъ, М. Дворіашъ, Горличъ, Прокопъ Шершневъ, Кириллъ Шершневъ, П. Копыловъ, Й. Кобылашка, Георгій Шукъ.**

Секретарь собранія **Ковалевскій.**

Постановленіе Припешскаго сельскаго общества Глѣмбочинской волости, Себежскаго уѣзда, Витебской губ.

1918 года, мая 12 дня.

Мы граждане Припешскаго сельскаго О-ва на полномъ собраніи обсудили вопросъ текущаго момента, изъ чего выяснилось, что Германскія представители въ Москвѣ требуютъ, чтобы Бѣлоруссія была независима отъ Россійской Республики.

Видя то, что въ настоящее время большая часть Бѣлоруссіи находится во власти нѣмцевъ и какія насилія и безчинства производятъ нѣмцы надъ нашими товарищами бѣлоруссами, подъ ихъ власть, боясь потерять добытую кровью Свободу и нежелая подпасть подъ иго нѣмцевъ и капиталистовъ—мы вышеуказанныя граждане единогласно постановили:

Просить Представителей Совѣтской власти, причислить насъ къ Россійской Республикѣ.

Председатель общественнаго Комитета **А. Боровикъ.**

Секретарь **Н. Скробовъ.**

12 мая 1918 года.

Дѣйствительность сей резолюціи Глѣмбочинскій Волости. Совѣтъ, Себежск. уѣзда удостовѣряетъ, 12 мая 1918 года.

Председатель Совѣта **А. Никитинъ.**

Секретарь (подпись неразборчива).

ВЫПИСКА

изъ протокола засѣданія Сокольницкаго волостного Совѣта 2 іюня 1918 года.

§ 1 Докладъ Витебскаго Отдѣленія Бѣлорусскаго Комиссаріата отъ 27-го Апрѣля с. г. за № 25 объ отторженіи Бѣлоруссіи отъ Россійской Федеративной Совѣтской Республики.

Обсудивъ настоящій вопросъ и имѣя въ виду, что съ отторженіемъ Бѣлоруссіи отъ Федеративной Россійской Республики, намъ грозитъ гибель добытой кровью нашыхъ сыновъ свободы, земли и воли подъ каблукомъ нашихъ враговъ ПОСТАНОВИЛИ: самымъ категорическимъ образомъ протестуемъ противъ отторженія Бѣлоруссіи отъ Россійской Федеративной Совѣтской Республики.

РЕЗОЛЮЦІЯ

по текущему моменту и задачахъ ближайшихъ дней, принятая на созванномъ секціей бѣлоруссовъ при Ц. К. партіи лѣвыхъ соц.-рев. собраніи митингѣ всѣхъ бѣлоруссовъ и бѣженцевъ изъ Бѣлоруссіи 13-го Іюня 1918 г. въ Москвѣ.

Собраніе призываетъ своихъ братьевъ всѣхъ трудящихся всего міра, въ этотъ рѣшительный моментъ міровой схватки-когда всемирная буржуазія дѣлаетъ послѣднія яростныя попытки растоптать Великую Революцію и вновь закабалить трудовыя массы и на крови и потѣ крестьянъ и рабочихъ создать свою ненавистную власть, сплотиться для общей борьбы съ международной реакціей.

Всѣхъ крестьянъ и рабочихъ, всѣхъ кому дороги интересы трудящихся, мы зовемъ къ найстойчивой организаціонной работѣ, зовемъ къ оружію, къ возстанію къ самой безпощадной борьбѣ съ имперіалистами и буржуазіей во всѣхъ странах.

Всѣ подъ красныя знамена Великой Соціальной Революціи.

Вмѣстѣ съ тѣмъ, Собраніе постановляетъ.

1) Декретъ о всеобщемъ обязательномъ воинскомъ обученіи долженъ проводиться въ жизнь.

2) Всѣ трудящія массы Бѣлоруссіи должны организоваться и сговориться какъ одинъ человѣкъ.

3) Долженъ быть положенъ конецъ передышкѣ, отдающей на растерзаніе помѣщикамъ и капиталистамъ подъ охраной германскаго имперіализма цѣлыя сотни тысячъ и милліонны крестьянъ и рабочихъ, отдѣльныя территоріи и національности.

З беларускаго жыцьця.

Народны Сакратарыят Беларусі гатовіць да друку так празываную „Белую кніжку“, у якую увойдуць усе важнейшыя дакументы, датыркаючыя часау барацьбы з народнымі Камісарамі заходняй вобласці, перагаворау з палякамі ды іншая.

У Пецярбуху беларускім атдзелам пры камісарыяту па справам нацыянальнасцяу у скорум чася будзя выдавацца два журналы „Чырвоны шлях“ і „Беларус“.

У Вітабску 13 чэрвяня сябар цантроваго камітэту жыдоускай партыі О. Е. С. Р. П., які быу старшыною Сакратарыяту Беларускай Народнай Распублікі М. Л. Гутман прачытау лекцыю аб Беларускай Распубліца.

У Маскве адбылося тры зборы сэкцыі беларускіх камуністау (бальшавікоу); на апошнім збору выбран часовы урад, якому даручана вырабіць дакладную запіску у Цантровы камітэт Расейскай Камуністычнай Партыі аб патрэбнасці заложэньня гэткай сэкці.

Сэкцыя беларусау пры Цантровым Камітэці лівых с.-р. с кожным часам пашырая сваю працу. Ею зробляна ужо у Маскве некулькі мітынгау, атаслана колькі таварышау у розныя мейсцы ля згуртаваньня там сэкцыяу, а так сама маюцца у скорум чася адчыніць агітацыйныя курсы і шмат чаго боляй. Сэкцыя мая спагаду сярод беларусау і да яе шмат прылучаецца людзей.

Въ Москвѣ образовалось Бѣлорусское Научно-Культурное Общество, ставящее своими задачами: а) всестороннее изученіе Бѣлоруссіи въ ея прошломъ и настоящемъ, б) поднятіе уровня культуры и экономическаго благосостоянія трудового народа и в) содѣйствіе разрѣшенію очередныхъ вопросовъ просвѣщенія.

Общество стремится объединить всѣ научныя, художественныя и вообще культурныя силы Бѣлоруссіи и лицъ, интересующихся ея изученіемъ.

Всѣ справки по дѣламъ Общества и запись въ члены производится у пр.-доц. В. Р. Брайцева (Пречистенка, № 3 кв. 8, тел. 4-28-58).

У Маскве заложан беларускі бежанскі Камітэт. На яго зборы выбран і паслан у гарацкі хаурус помачы бежанцау свой прадстаунік.

Мэта камітэту зрабіць беларускі атдзел у гэтум хауруся.

Толькі што прыехаушы з забранай Беларусі чалавек вось што расказвая аб палажэньню, якоя цяпер панує там: С першаго часу, скора немцы увайшлі у Мінск, яны сябе вялі досі далікатна: у справы ніякія няумешваліся, зусімі абыходзіліся ласкава і паважна. Але с кожным часам яны пачалі аб сабе больш і больш падаваць знаць і цяпер дайшло да таго, што сапрауды яны трымаюць усю уладу. Уперад яшчэ сілу мелі палякі, бо з немцамі жылі добра, цяпер жа найбольшыя кары сыплюцца немцамі на палякоу. А зборышчах дауно забылі; з выходзіушых 9 газэт—восім зачынілі і асталася толькі адна. Уведзяна цанзура. Першаго маю было заарыштавана дваццаць чалавек, якіх злавілі на дэманстрацыі і прысудзілі усіх да смерці, але прыяхджаушы Ляапольд Баварскіх памілувау. Дужа дрэнна стаіць справа з ядою: на конт гэтаго можна сказаць, што у Мінску сапраудны голад: мяса даюць на тыдзянь $^5/_8$ фунта, а то сусім нядаюць, другіх рачэй німашака. У харчоунях, якія адчыняны толькі тры дні у тыдзянь нічога з яды нядастаць; а што і іосць, та пахавана, бо баяцца класці на паказ. Немцы займаюцца настаяшчым грабствам. Зайходзяць салдаты па харчавых і растаранах і калі што пападаяцца на вочы, бяруць, складаюць у банькі і адсылаюць у Гэрманю. Гэтакім спосабам забрана у Мінску уся мука, з якоя яны выпякалі што дня па 4000 пудоу хлеба і адсылалі. Адтуль жа прысылалі хлеб з ваднае саломы, ажно у рот нельга было узяць; крыху пошля хлеб стау лепшы.

Ні хвабрыкі ні заводы ня робяць, крамы заперты. Увесь горад дагэтуль шумны і людны—апусцеу і заміор. Хто як ня зарве—стараецца уцячы. Супроць немцау у ваусіх расце зняцавольства, якоя с часу на час можа выліваца у адчыняную барацьбу. Гэта яны знаюць і стараюцца паказаць, што іх у Мінску дужа многа: дзеля гэтаго яны выдаюць прыказы, каб ахвіцэры нязменна знаходзіліся на вуліцы і маршавалі нясупынна сюды йтуды. „Я сам бачыу,—сказау раскашчык, як на Захараускай вуліцы адзін ляйтанант праехау боляй 10 разоу сюды й туды“. Па праудзя ж у Мінску немцау вельмі мала. Ля выязду у Расею немцы выдаюць пращпарты якія дастаць ад іх няцяшка... Гэткая палажэнья у Мінску. У меньшых гарадох многа горай: гэтак, у Слуцку камандант выдау пастанову, каб усе гараджаня атдавалі нямецкім ахвіцэрам чэсць. Некаторым дужа цяшка адлічыць ахвіцэра ад салдата і вось почасту можна бачыць, як ціомныя селяня і гаражаня здымаюць шапкі і перад салдатамі. На віосках бязсціханна ідзе раквізыцыя. „Палажэньня проста нямажлівая“, закончыу расказчык.

Аб усім па троху.

Праз Стакгольму навядамляюць, што у Фінляндзі арыштована каля 80.000 чалавек, якіх звінавачваюцьу злуца з равалюцыяй. Фінлянская правіцяльства стараяцца ачысціць усе установы і інстітуцыі ад расейскіх людзей. Надоячы абвешчан рашчот 130 расейцам, якія працуюць у Фінлянскуй пошця.

З Мадрыду (Гішпаньня) атрымана вестка, што ахвіцэру Мартыну Рубі даручана заняцца распрацаваньням пляны аб збудоулі падводнаго тунелю у найболяй вузкуй часціні Гібралтарскаго праліву (што пам'ж Сяродземным морам і Атлантычным акіяпам). Работа на гэта патрабуя каля пяці гадоу тэрміну.

Камісарыят асьветы прыняу праграму (парадак) Інсцітуту, які мая мэтаю пазнаваць мозак і псіхічную (духоуную) дзеяльнасць, ля Псіханяуралагічнаго інсцітуту. Ля закладзін інсцітуту дадзяна авансам (уперад) 100.000 руб.

Нямецкі Райстаг (нібы наша быушая гасударская дума) прыняу закон, згодна катораму крымінальна караяцца той мужчына ці кабета, які, ведаючы, што іон хварэя пранцамі, ня лечыцца і мая адносіны да кабеты калі мужчына і наадварот.

Мужчына ці кабета, якіх падсачаць, што яны хворыя, будуць падлежны доктарскуй сочца, прымусова агледжаны і пацягнуты да лекау.

Вымаган гэты закон тым, што за часы вайны пранцы у Нямеччыня пашырыліся да народнае пошасці.

Надоячы адбылося у Вені (Аустрыя) пасяджэньня нямецкіх нацыянальных партыяу, у драбязе абраджвалася палітычная палажэньня.

Была выказана думка, што вельма быу бы патрэбян хуччэйшы склік парлямэнту, але дзеля гэтаго патрэбна няйначай закладзіна у іом большасці, якая магла б перамагчы варожную апазыцыю (нязгодчыкау) з боку чэхау і паудзіонных славян, якія маюць вялікую сілу і вагу.

Нягляздзючы на тоя, што у Празя і іншых гарадох Чэхі цягнуцца бунты, якія стрымоуваюцца ужо ня аустрыяцкім, а гэрманскім войскам, аустрыяцкуя правіцяльства начало гатовіцца да работы ля падзелу Чэхі на дванапцаць новых вакруг на закладзінах, узятых з апошняе усенароднае пярепісы. Нямецкі начальнік краю будзя кіраваць сваімі вакругамі у Летамерыцах, чэшацкі у Вінаградах, а пражацкая мейсцічаства захавая агульны нагляд за раздзеляным чэшацкім каралеуствам. Толькі набора хаурусьнікау можа абараніць Чэхію ад грозячаю іой падзелу.

Сярот украінскіх палітычных дзеячау устала думка каб склікаць з'езд пахожы на адбыушы у леташнюм годзя у Кіявя нацыянальны кангрэс. Гэтакі з'езд украінскімі дзеячамі лічыцца патрэбным дзеля таго, каб падлічыць нацыянальныя сілы і прыняць агульныя ля усяго нацыянальнаго хронту лёзунгі.

Агульны лік уцякачоу з Фінляндзі пошля таго, як немцы з белагвардзейцамі пачалі пакараць чырвонагвардзейцау, налічваяцца каля 12.000 чалавек. Сацыялісты Такой і Маняр звярнуліся да радавай уласці з праханьням разрашыць залажыць фінскую калонію з уцякачоу ня у Сыбіру, як мелася быць, а у ваколіцах Кастрамскоя, Валагоцкае ці Вяцкае губ.

Як вядома, у Закапказ'і быу сабран сойм, які лічыуся урадам усяго Закапказ'я і у які увайходзілі усе народы Закапказ'я. Надоячы гэты Сойм раскідауся і з яго вылучылася правіцяльства Грузі якоя і абвясціла Груз'ю незалежнай. На дніох Грузія памірылася з Турцыяй.

У Пецярбурзі асобным дакрэтам Ц. І. К. Хаурусу камун Пауночнай вобласці, скасованы асобныя нацыянальныя камісарыяты, а застауляны отдзелы пры адным камісар'яту па справам нацыянальнасцяу.

Радактары:
З. Жылуновіч, Я. Петровіч.
Выдавец:
Беларускі Нацыянальны Камісарыят.

Типографія Сов. Раб. и Солд. Деп. Москва, Тверская, Мамановскій пер., д. 12.